# «Пяць гадочкаў Пеця Вучыўся на бюджэце...»

**Што было, — было. Адзін мужчынка ў ЗАГС прыйшоў — з пашпартам і пачкам грошай. «Хачу, — кажа, — нацыянальнасць змяніць». — «У вас тут, — чытае загадчыца, — напісана беларус. Вы хацелі б што іншае?» — «Не, хай застаецца тое ж... Толькі наперадзе адно слоўка дадайце: «Новы».**

З гэтым складанасцяў у чалавека, відаць, не ўзнікла, таму ён іншай праблемай задаўся: наняў спецыяліста, каб аблічыў, колькі дроў на зіму спатрэбіцца. Той доўга, з выездам на месца, вывучаў праект, нешта мераў, лічыў колькасць пакояў, печак-камінаў, вокнаў... А ўрэшце выдаў: ад 30 да... 300 кубаметраў. «Колькі-колькі?!» — не паверыў вушам той новы. — За што я грошы плаціў? Чаму такая лічба прыблізная?» — «Дык скуль ёй дакладнай быць, калі ніхто не ведае, якая будзе зіма?»

Адно зразумела (прычым кожнаму) — яна будзе! І, відаць, таму апошні конкурсны здымак (можна яшчэ раз глянуць на верхні) падштурхнуў да творчасці многіх чытачоў: ва ўсякім разе, падпісаў — хоць каўшамі бяры! І ў кожным — нешта ёсць! А зрэшты, чытайце самі:

*Пасля здаўна святых Пакроў,*
*Калі зямля адпачывае,*
*Пашчыраваць ля пабудоў*
*Пара, нарэшце, наступае.*
*Міхась прачысціў дымаход*
*(Спачатку свой, затым — суседчын),*
*Каб сустракаць зімы прыход*
*Не абы-як — па-чалавечы.*

Згадзіцеся, пахвальная пазіцыя! Не дзіва, што ёй, вось такой, прысвяціла свае радкі не толькі **спадарыня Ніна Бурко з Бярэзіншчыны,** але і **спадар Мікола Кісель з Мінска:**

*Камінар такі смяльчак —*
*Бач, забраўся на вільчак:*
*Ранкам панядзелка*
*Трубы чысціць дзеўкам.*

А ў іншых — не вам казаць — пасля выхадных свае гараць...

Зрэшты, тут і вось зараз не столькі пра іх, — з «падачы» **спадарыні Соф'і Кусянковай з вёскі Лучын, што на Рагачоўшчыне:**

*Рады Ганна з Мойшам,*
*Што сусед харошы,*
*Дымаход пачысціў*
*І падладзіў юшкі*
*Без капейкі грошай,*
*Нават без чакушкі!*

Гэткія ж у людзей і сваякі бываюць. Прыклад патрэбен? Ды калі ласка:

*Кліч ад цешчы быў як SOS...*
*На яго й ляцеў Хвядос,*
*«Сеўшы» мігам ля трубы,*
*Комін чысціў — не абы...*
*Зараз будзе печка грэць,*
*Не капціць і не дымець —*
*Небяспека знішчана,*
*Дымаход ачышчаны! —*

радуецца за цешчу **спадарыня Іна Алісевіч з Уздзеншчыны,** а **Валянціна Гудачкова з Жыткавіч дык** найбольш за камінара, бо:

*Гаварыла так кума:*
*«Будзе пляшачка віна*
*І з вяндлінкай бутэрброд,*
*Як прачысціш дымаход».*
*Ясь згадзіўся...*
*Добра жыць!*
*Можа, бізнес свой адкрыць?*

Ну чаму б і не, калі першапачатковы капітал амаль не патрэбен, вытворчыя памяшканні — таксама. Нават рэкламная абвестка ўжо гатовая: **спадарыня Кусянкова** прыдумала — задарма аддае:

*«Чышчу коміны ад сажы!*
*Дзе патрэбна, там падмажу...*
*І вазьму зусім няшмат!»*
*Коля ў вёсцы — нарасхват.*

Па якой прычыне, можна было б не тлумачыць, але ж **спадар Віктар Сабалеўскі з Узды** гэта зрабіў і нават перспектыву ўбачыў:

*Многа ў вёсцы дымаходаў, —*
*«Верхалазаў?*
*Хіба Коля», —*
*Ад чаго (і з кожным годам)*
*За паслугу просіць болей:*
*То натуры, то валюты,*
*А як будзе спрыты,*
*За работу атрымае*
*Не адну паўлітру!*

Што (на першы погляд), вядома ж, выгадна і таму (нават з таго ж канверта) —

*...Хоць Мікола і з дыпломам,*
*Быць не хоча аграномам:*
*Прадаваў на рынку кветкі —*
*Разваліўся бізнес гэткі.*
*Каб не стацца дармаедам,*
*Плёў кашы з суседам-дзедам.*
*Дзед — памёр.*
*Няма больш пары.*
*Дык спрабуе камінарам...*

Іншая рэч, ці так гэта проста?

Пачысціць комін яшчэ трэба ўмець, — заўважае **спадар Іван Сіманёнак з Пастаў,** — бо найбольей сажы (нярэдка спрасаванай) «залягае» досыць нізка, амаль на ўзроўні юшкі. Але ж да яе і дабраліся, і вычышчалі. І для гэтага ўсяго і трэ было, што ладны груз, кілаграмаў на пяць, моцная вяроўчына і елачка. А венік у коміне — гэта нейкая дурата, дзіцячая забава...

Адкуль:

*Стась нагараваўся*
*З комінам над хатай,*
*Марна упіраўся*
*З венікам рагатым...*
*Дзецюку-мужчыну*
*Тут любы дарадзіць —*
*Слабенькім начыннем*
*Коміны не гладзяць!*

З парадай наконт рыштунку выступае і **спадарыня Гудачкова.** «У мяне амаль такая ж труба, як на гэтым здымку», — заўважае яна. І дае цалкам прымальную параду:

*Венік сажу не бярэ?*
*Нечым адкалупваць?*
*Трэба, хлопча, па трубе*
*Малатком пастукаць.*

Альбо іншы спосаб пашукаць. А ўжо дзе? Падказкі ад **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска:**

*Смелы і вясёлы*
*На каньку прымак,*
*Ды нейкі ж неталковы —*
*Усё ў яго не так!..*
*Калі не цяміш, Вася,*
*Як і што рабіць,*
*У цешчы пацікаўся —*
*Скажа, так і быць!*

А зрэшты, шукаць інфармацыю ў людзей старэйшых маладыя цяпер не любяць. У іх — іншыя аўтарытэты:

*Паўдня шукаў Афоня*
*Парады у смартфоне!*
*Бубніў адтуль прафесар*
*Пра трубы і кампрэсар...*
*А ўрэшце баба Капа*
*Звязала венік з лапак,*
*І ўнук*
*такой мятлою*
*Расправіўся з бядою.*

Бо трэба... І ўжо даўно, як лічыць **спадарыня Галіна Пятроўская са Смаргоншчыны:**

*Хаты цепліць нам пара —*
*Адступіла восень.*
*Нават кот прыйшоў з двара*
*І пагрэцца просіць.*



Можа, на сваю галаву?.. Баялі, адзін вайсковец (зараджаючым на флоце служыў) на пабыўку ў вёску прыехаў. Матуля з той радасці і чарку яму наліла, і ад пуза накарміла... Да грубкі хлапчына ледзьве адпоўз; па звычцы падпаліў, узяў на калені катка і газету (можа, нават нашу...), пагладзіў, нешта пачытаў ды і задрамаў, шчаслівы — не ўбачыў, як з печкі вугольчык пстрыкнуў...

Што далей было, чытаць трэба хутка. Маці ў крык: «Агонь!» Сын — на ногі, ката — у печ, дзверцы на «замок», сам у струнку: «Гармата к бою гатова!»

Каб вось гэтак мы — да зімы. А то ж, згадзіцеся, халады часам заспяваюць знянацку, дзякуючы чаму той кот зусім не пацярпеў, бо, паводле **спадара Мікалая Касмачэўскага з Наваполацка,**

*Печку затапіў Пятрок —*
*Штось на хату прэ дымок:*
*Ну зусім ніякай цягі...*
*Гаспадар —*
*а нуль увагі,*
*Што ў трубе, навідавоку,*
*Пасяліліся сарокі.*

З тога ж канверта — яшчэ адна актуальная прычына:

*Каля печы — дым, гамонка.*
*Не уцяміць зранку жонка:*
*— Мусіць, нам у каляду*
*Хтосьці «вынайшаў» бяду,*
*Якой зроду не было:*
*Палажыў на комін шкло?!*

...Але ж — згледзелі чытачы (за што рэспект і ўважуха, як кажа моладзь) і безліч іншых тэм, часам — зусім нечаканых.

«Давайце яшчэ раз прачытаем «Мойдодыра», — прапануе **спадар Мікалай Старых з Гомеля,** — і звернем увагу на радкі:

*«А нечыстым*
*Трубочистам —*
*Стыд и срам!»*

На думку спадара Міколы, не варта абражаць людзей, якія робяць хай брудную, але ж патрэбную справу.

Ад яго ж і слушная «папраўка»:

*Майдадыр ты наш*
*шаноўны —*
*Чысціні баец галоўны,*
*Каб не праца камінара,*
*Люд цярпеў бы*
*ад пажараў...*
*Хто працоўных зневажае,*
*Мусіць, сораму не мае?!*

Хоць часам — на жаль і на думку **спадарыні Чыгрынавай** — тыя самыя працоўныя іншага і не заслугоўваюць:

*Развал у гэтай хаце*
*Зрабіўся не за раз,*
*Рабочых з біржы працы*
*Прымалі у калгас.*
*Жылі тут пустадомкі,*
*І запар...*
*тры сям'і,*
*Што хлеб шукалі лёгкі*
*І доўгія рублі.*

З таго ж канверта і дасціпнае:

*Не бурай дах парвала,*
*Трубу не гнуў віхор,*
*Шабашка працавала, —*
*Ёй ганьба і дакор...*
*Але ж аб'ект прынялі,*
*Хоць зроблена так-сяк,*
*Бо ўмела налівалі*
*Гарэлку і каньяк.*

Як доўга вілася гэтая вяровачка, невядома, але ж канец ёй (паводле **спадара Сабалеўскага**) настаў:

*Янку новая мятла*
*Ў камінары замяла:*
*Кіраваў, нібы, лягасам,*
*СВК і камунгасам —*
*Горла драў аж да знявагі,*
*На рабочых — нуль увагі...*
*А пазбавіўся пасад —*
*І такой вось працы рад.*

А зрэшты, ёю, як лічыць моладзь у асобе **васьмікласніцы СШ № 3 г. Вілейка Карыны Цанунінай,** тут якраз і не пахне:

*Павер, чытач мой дарагі,*
*Не будзе іншай тут работы,*
*Бо гэты ўнук Бабы Ягі*
*Ізноў рыхтуецца да ўзлёту.*
*І для гэтага*
*Адабраў у Бабы Ёжкі*
*Сродак транспартны ўнук,*
*Па-над вёскаю пагойсаў,*
*Нібы ластаўка ці жук.*
*Ды за комін зачапіўся,*
*І куды падзеўся понт:*
*Трэба тэпаць з гэткай высі*
*Да Кашчэя ў капрамонт.*

Гэта — зноў жа — **спадар Сабалеўскі,** а следам за ім і **спадарыня Наталля Шкут са Светлагоршчыны:**

*Ёсць мятла...*
*Сюды б і ступу,*
*Лахманы і «макіяж».*
*Не глядзелі б зараз тупа:*
*Скуль жа гэты персанаж?*

Досыць нечаканы адказ на такое пытанне ў **спадарыні Чыгрынавай:**

*Пяць гадочкаў Пеця*
*Вучыўся на бюджэце.*
*Далей — размеркаванне,*
*Як тэст на выжыванне,*
*У слабенечкі калгас...*
*І жытло — на першы час.*

Іншы, згадзіцеся, спалохаўся б — вось такога дома, жытла (можна яшчэ раз зірнуць на здымак), а гэты — здымаем капялюш — не: чым можа, чысціць свой комін, збіраецца жыць і працаваць.

Аптыміст: на такіх, кажуць, шмат што атрымаецца, бо галоўнае для іх — не здавацца, выйсце шукаць з любой, нават, здавалася б, самай безнадзейнай сітуацыі, якую ўбачыла на здымку тая ж **спадарыня Кусянкова:**

*Не звяртала Вера*
*Ўвагі на Валеру,*
*Тады гэты вастраслоў*
*З боку «цешчы» падышоў:*
*Комін ёй падладзіў —*
*Без віна, без грошай...*
*І прызнала Ўладзя:*
*Будзе зяць харошы.*

Засталося дачку пераканаць...

Тую ж любоўную лінію адшукалі на здымку і **сужэнцы Астроўскія з Мінска**

*Ходзяць чуткі, што у Яся*
*Ёсць суседачка Настасся*
*І ён ходзіць не абы...*
*Ўжо дабраўся да трубы.*
*А што будзе — паглядзім —*
*Паміж ёй і паміж ім.*

...А зрэшты, вернемся (з падачы **спадарыні Гудачковай**) да таго, з чаго пачалі вось гэты агляд:

*Кажуць вучаныя людзі,*
*Што зімы болей не будзе...*
*Толькі веры ў гэта мала —*
*Трубы чысцім дасканала.*
*Дроўцы сушым у запас —*
*МНС пахваліць нас.*

Мо нават прэмію выдасць, бо не ўсё ж прадпісанні пакідаць ды штрафы налічваць за тое, што (паводле **сужэнцаў Астроўскіх**)

*Мы жывём, як павялося,*
*Больш з надзеяй на Авося.*
*Хоць Авось той —*
*не вяльможа*
*І нашкодзіць гэтак можа...*
*Так што грэбуй ці не грэбуй,*
*А трубу пачысціць трэба!*

Вось на гэтай аптымістычнай ноце і завяршылі б чарговы агляд, калі б не вынікі.

Такім чынам, паводле вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі пра самотную бландзінку-маляра (гл. нумар «Звязды» ад 2 кастрычніка) напісалі **спадарыні Любоў Чыгрынава з Мінска і Валянціна Гудачкова з Жыткавіч, спадары — тры Міколы — Касмачэўскі з Наваполацка, Кісель з Мінска і Старых з Гомеля,** а таксама **Валерый Гаўрыш з Чавус...** З чым, павагаўшыся, згадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. Такім чынам, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на першы квартал 2020 года накіроўваецца ў слаўны горад Чавусы.

Хочаце, каб газета пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас? Тады варыянтаў два: альбо афарміць падпіску, альбо ўважліва паглядзець на чарговы здымак, прыдумаць да яго подпіс (можна некалькі, але трапных, дасціпных і кароткіх — не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Шанц на перамогу мае кожны! Як той казаў, некалі мы сустрэнем шчасце, а пакуль будзем сустракаць Каляды і Новы 2020...

Спадзяёмся, разам?

**Валянціна ДОЎНАР.**

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

